Аляксандру Лукашэнку
Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь
E-mail : contact@president.gov.by
Факс : +375 17226 06 10

Аляксандру Канюку
Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь
E-mail : info@prokuratura.gov.by
Факс: +375 17 226 42 52

HUMAN RIGHTS HOUSE FOUNDATION

2 кастрычніка 2012

**Пра: Заклік да неадкладнага вызвалення і зняцця абвінавачванняў супраць праваабаронцы Алеся Бяляцкага і спынення пераследу і зневажаючага чалавечую годнасць абыходжання ў дачыненні да яго падчас яго знаходжання ў турме**

Сп. Прэзідэнт,
Сп. Генеральны пракурор,

Мы, ніжэйпадпісаныя чальцы і партнёры Сеткі Дамоў правоў чалавека, глыбока занепакоены ўтрыманнем пад вартай Алеся Бяляцкага і істотным пагаршэннем гэтых ўмоў. Алесь Бяляцкі з'яўляецца кіраўніком праваабарончага цэнтра «Вясна» ў Беларусі, віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) і адным з заснавальнікаў Беларускага Дома правоў чалавека ў Вільні (Літва).

Паводле атрыманай ад нашых партнёраў інфармацыі, правы Алеся Бяляцкага на прыём наведвальнікаў і атрыманне харчовых перадач былі моцна абмежаваныя.

Вынікам гэтых і іншых мер, прынятых супраць Алеся Бяляцкага падчас яго зняволення, з'яўляецца сур'ёзнае пагаршэнне яго здароўя.

Мы хацелі б адзначыць, што апошняе пагаршэнне ўмоў утрымання Алеся Бяляцкага пад вартай адбылося адразу пасля таго, як яму споўнілася 50 гадоў. Ён атрымаў прывітанні і віншаванні ад праваабаронцаў з ўсяго свету, а таксама ад міжнароднай супольнасці, у тым ліку Камісара Еўрапейскага Саюза па пытаннях пашырэння і Еўрапейскай палітыкі суседства Штэфана Фюле, усе яны заклікаюць да яго неадкладнага вызвалення.

Мы разглядаем вышэйзгаданыя меры ўтрымання як дадатковае пакаранне ў дачыненні да Алеся Бяляцкага ў сувязі з яго законнай дзейнасцю ў галіне правоў чалавека. Мы таксама бачым сувязь паміж міжнароднай увагай, якую ён атрымаў у свой дзень нараджэння, і гэтымі мерамі.

Улады Беларусі абавязаныя, у адпаведнасці з міжнародным правам, у тым ліку артыкулам 6 і 10 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, забяспечваць, каб нічый стан здароўя не пагаршаўся пад час знаходжання пад вартай. Мы ўскладаем адказнасць адказнасць за пагаршэнне здароўя Алеся Бяляцкага, пакуль ён знаходзіцца ў зняволенні, на улады Беларусі.

**Мы заклікаем беларускія ўлады:**

- **неадкладна вызваліць Алеся Бяляцкага, зняць усе абвінавачванні супраць яго і цалкам рэабілітаваць яго;**
- **да моманту вызвалення забяспечыць Алесю Бяляцкаму ў поўнай ступені доступ да медыцынскай дапамогі, якая яму патрэбна, і гарантаваць, што ўмовы ўтрымання ў турме не адаб'юцца на стане яго здароўя;**
- **забяспечыць Алесю Бяляцкаму ў поўнай ступені права прыймаць наведвальнікаў і атрымліваць прыватную карэспандэнцыю.**



OSLO Kirkegt. 5, 0153 Oslo, Norway | Tel.: +47 22 47 92 47 | Fax: +47 22 47 92 01 | hrh@humanrightshouse.org | Org. no.: 976 055 365 | Account no. (IBAN): NO37 1609 0492 458
GENEVA Rue de Varembé 1, PO Box 35 1211 Geneva 20, Switzerland | Tel.: +4122 332 25 53 | geneva@humanrightshouse.org | Account no. (IBAN): CH36 0900 0000 1020 3098 5
www.humanrightshouse.org

Знаходжанне Алеся Бяляцкага пад вартай з'яўляецца следствам уведзеных у Беларусі абмежаванняў правоў на свабоду аб’яднанняў і выказванняў. Як і іншым шматлікім НДА ў Беларусі, «Вясне» неаднаразова адмаўлялі ў рэгістрацыі, гэтая адмова кваліфікавалася як неабгрунтаваная Камітэтам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека. Такім чынам, Алесь Бяляцкі быў вымушаны развіваць сваю праваабарончую дзейнасць у падполлі. Яму не дазвалялі свабодна аб’ядноўвацца з іншымі людзьмі і выказваць свае меркаванні.

Мы лічым, што беларускія ўлады павінны прыняць усе неабходныя меры дзеля таго, каб дазволіць праваабаронцам працаваць свабодна і без абразлівых абмежаванняў, у тым ліку шляхам прадстаўлення рэгістрацыі праваабарончым арганізацыям і адмовы ад выкарыстання рэгістрацыі НДА у якасці інструмента для падаўлення крытычных галасоў, як пазначана ў Дэкларацыі аб праваабаронцах.[1]

- Беларускі дом правоў чалавека ў Вільнюсе

- Азербайджанскі Дом правоў чалавека
  - Праваабарончы цэнтр
  - Жаночая асацыяцыя за рацыянальнае развіццё (WARD)

- Дом правоў чалавека ў Сараева
  - Асацыяцыя жанчын-грамадзянак "Renaissance"
  - Фундацыя CURE
  - Хельсінкскі камітэт па правах чалавека ў Босніі і Герцагавіне
  - Рэгіянальны каардынатар па маладзёвых групах
  - Сербская грамадзянская рада
  - Цэнтр « Жанчына і грамадства »

- Дом правоў чалавека ў Загрэбе
  - Асацыяцыя садзейнічання забеспячэнню роўных магчымасцяў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі - APEO/UPIM
  - «Будзь актыўным, будзь эмансіпаваным» B.a.B.e.
  - Цэнтр па вывучэнні праблем мірнага існавання (CMS)
  - Documenta – Цэнтр працы з мінулым
  - Svitanje - Асацыяцыя па абароне і ўмацаванні псіхічнага здароўя
  - GOLJP - Грамадзянскі камітэт па правах чалавека

- Дом правоў чалавека ў Тбілісі
  - Артыкул 42 Канстытуцыі
  - Каўказскі цэнтр па правах чалавека і даследаванню канфліктаў (CAUCASIA)
  - Грузінскі цэнтр псіхасацыяльнай і медыцынскай рэабілітацыі ахвяр катаванняў – GCRT

- Дом правоў чалавека ў Осла
  - Інфармацыя па абароне здароўя і сацыяльных правоў
  - Фундацыя дамоў правоў чалавека
  - Нарвежскі Камітэт па Бірме
  - FIAN Norway

[1] Дэкларацыя аб праве і абавязку асоб, груп і органаў грамадства заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды A/RES/53/144, 8 сакавіка 1999.



OSLO Kirkegt. 5, 0153 Oslo, Norway | Tel.: +47 22 47 92 47 | Fax: +47 22 47 92 01 | hrh@humanrightshouse.org | Org. no.: 976 055 365 | Account no. (IBAN): NO37 1609 0492 458
GENEVA Rue de Varembé 1, PO Box 35 1211 Geneva 20, Switzerland | Tel.: +4122 332 25 53 | geneva@humanrightshouse.org | Account no. (IBAN): CH36 0900 0000 1020 3098 5
www.humanrightshouse.org

- Нарвежскі Хельсінкскі камітэт

- Хельсінкскі фонд па правах чалавека ў Польшчы

- Расійскі даследчы цэнтр па правах чалавека
  - Міжрэгіянальная група «Праваабарончая сетка»
  - Незалежная псіхіятрычная асацыяцыя Расіі
  - Цэнтр садзейнічання рэформе крымінальнага правасуддзя
  - Маскоўская Хельсінкская група
  - Фонд «Права маці»
  - «Міжнароднае ненасілле»
  - «Права дзіцяці»
  - «Права на жыццё і грамадзянскую годнасць»
  - Саюз камітэтаў салдацкіх маці
  - Фонд «Сацыяльнае партнёрства»

- Дом правоў чалавека ў Варонежы
- Армянская Хельсінкская Асацыяцыя
- Шаххатун, Арменія
- Бялградскі цэнтр па правах чалавека
- Хельсінкскі камітэт па правах чалавека ў Сербіі
- Клуб правоў чалавека, Азербайджан
- Украінскі хельсінскі саюз па правах чалавека
- Артыкул 19, Вялікабрытанія
- Індэкс цэнзуры, Вялікабрытанія
- Праваабарончы фонд Рафта, Нарвегія

*Копіі былі накіраваны:*

- Ва Упраўленне Вярхоўнага камісара па правах чалавека Савета Еўропы, Страсбург
- Спецыяльнаму дакладчыку ААН па пытаннях катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання, Жэнева
- Спецыяльнаму дакладчыку ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, Жэнева
- У Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ), Варшава
- У Дэлегацыю Еўрапейскага Саюза ў Рэспубліцы Беларусь
- У Падкамітэт па правах чалавека Еўрапейскага парламента, Брусэль
- У Прадстаўніцтва Беларусі пры ААН у Жэневе
- У прадстаўніцтвы розных краін у Беларусі і міністэрствы замежных спраў розных краін

**Аб Сетцы дамоў правоў чалавека** (www.humanrightshouse.org)
Сетка дамоў правоў чалавека ўяўляе сабой форум супрацоўніцтва паміж існуючымі і новымі Дамамі правоў чалавека, якая аб'ядноўвае 70 НДА ў 15 краінах з Заходніх Балкан, Усходняй Еўропы і Паўднёвага Каўказу, Усходняй Афрыкі і Афрыканскага Рога, а таксама Заходняй Еўропы. Мэта Сеткі Дамоў правоў чалавека палягае ў тым, каб абараняць, умацоўваць і падтрымліваць праваабаронцаў і іх арганізацыі. Фундацыя Дамоў правоў чалавека, якая месціцца ў Осла (Нарвегія) і Жэневе (Швейцарыя), з'яўляецца сакратарыятам Сеткі Дамоў правоў чалавека.



OSLO Kirkegt. 5, 0153 Oslo, Norway | Tel.: +47 22 47 92 47 | Fax: +47 22 47 92 01 | hrh@humanrightshouse.org | Org. no.: 976 055 365 | Account no. (IBAN): NO37 1609 0492 458
GENEVA Rue de Varembé 1, PO Box 35 1211 Geneva 20, Switzerland | Tel.: +4122 332 25 53 | geneva@humanrightshouse.org | Account no. (IBAN): CH36 0900 0000 1020 3098 5
www.humanrightshouse.org